ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ЧАЦВЕР
7 красавіка
1994 года
№ 1
(1706)

## АНОНС НУМАРА

***На 3-яй старонцы чытайце ўспаміны пра наш універсітэт Іны Рытар (Аляксандры Саковіч), беларускай пісьменніцы, якая цяпер жыве і працуе ў Амерыцы. Гэта — першая публікацыя ў Беларусі.***

* * *

***На 4-й старонцы — незвычайны матэрыял з жыцця студэнтаў фізічнага факультэта.***

● ГЭТА — МЫ

# КАРАЛЕВА ВОЛЬГА, або Прыгажосць выратуе... конкурс



**На фотаздымку: Вольга Тачыліна** **Фота М. Жылінскай**

Пакой нагадвае кветкавую аранжарэю. Оля акінула позіркам падарункі і закрыла вочы. Але спаць не хацелася. Падзеі некалькіх апошніх гадзін «пракручваліся» ў галаве з вялікай хуткасцю: сцэна, музыка, святло, ізноў сцэна, музыка... Не, заснуць не атрымліваецца. Толькі што яна была ў акружэнні знаёмых, сяброў, паклоннікаў, а зараз... Зараз адна са сваімі думкамі і пачуццямі. Трэба хоць чаю папіць. Оля пайшла на кухню... Вось і слоік з варэннем... Ой... Нічога, гэта на шчасце... Яна сядзіць над асколкамі шкла і жартоўна кажа: «Ну вось, «каралева», разбегліся твае «слугі», прыбірай зараз сама». Так закончваўся апошні дзень студэнткі Олі Тачылінай і першы дзень Каралевы Вольгі — пераможцы конкурсу прыгажосці «Міс Універсітэт».

Адбыўся конкурс у памяшканні Белсаўпрафа 21 сакавіка. За карону змагаліся 11 прэтэндэнтак — прыгожых студэнтак старэйшай у рэспубліцы ВНУ — Беларускага дзяржаўнага універсітэту. У мінулым конкурсы — «міф аб сабе», у якім удзельніцы прадстаўляліся, распавядалі пра свае любімыя занямкі і захапленні, а журы ацэньвала змест «міфа», знешнія даныя, артыстычнасць канкурсантак, «прафесійны» конкурс, які даў магчымасць прэтэндэнткам пазнаёміць журы і гледачоў з сваёй будучай прафесіяй. І вось Вольга Тачыліна атрымлівае карону. Тытул «Віцэ-Міс Універсітэт» прысуджаны Наталлі Філіпчык, а «Міс Чароўнасць» стала Наталля Грыгаровіч.

Шоу, якое ўбачылі гледачы,— гэта толькі частка работы, што правялі арганізатары конкурсу прыгажосці «Міс Універсітэт». «За кадрам» засталіся штодзённыя рэпетыцыі, пашыў касцюмаў, падбіранне музыкі. На пытанні, звязаныя з падрыхтоўкай і правядзеннем конкурсу, адказвае адзін з яго арганізатараў, стваральнік і кіраўнік Тэатра моды «Апрель-Ширвель», студэнтка 2-га курса факультэта журналістыкі **Святлана КАРЖОВА.**

**— Святлана, якое дачыненне «Апрель-Ширвель» мае да конкурса прыгажосці «Міс Універсітэт»?**

— Наш Тэатр моды звязаны з конкурсам самым непасрэдным чынам — амаль палова прэтэндэнтак — манекеншчыцы Тэатра, а я з'яўляюся аўтарам калекцыі адзення, у якім выходзілі на сцэну ўсе ўдзельніцы. Тэатр існуе ўжо амаль паўгода. Кожная манекеншчыца прайшла адбор, і таму можна сказаць, што ўдзельніцы конкурсу «Міс Універсітэт» былі адабраны загадзя.

**— А чаму менавіта зараз упершыню праводзіцца конкурс, бо, здаецца, самы пік конкурсаў прыгажосці быў у 1988—90 гадах. Лепей раз убачыць...?**

— Так. Студэнты даўно пыталіся, калі такі конкурс будзе праведзены ва універсітэце. Да таго ж, наш конкурс не вельмі падобны да астатніх. Перад намі стаяла задача знайсці не проста прыгожы твар, а асобу, якая прадстаўляла б наш універсітэт. Каб гэта быў дастойны, разумны, цікавы чалавек.

**— І задача выканана?**

— Я лічу, што так.

**— Як ішла падрыхтоўка да фінальнага прадстаўлення?**

— У той час я хварэла і адразу пасля выздараўлення прынялася за працу. Дзяўчынкам трэба было «ставіць» паходкі, вучыць паводзіць сябе на сцэне і нават усміхацца. Да таго ж над фіналісткамі ўжо «папрацавалі», і мне даводзілася адвучаць іх ад таго, чаму іх аспелі навучыць, а гэта яшчэ складаней, чым пачынаць спачатку. Кожны вечар мы збіраліся і пад бытавы магнітафон, які прыносілі самі канкурсанткі, рэпетыравалі. Канешне, відавочнай была адсутнасць вопыту ў правядзенні конкурсаў, а дзесьці — і рэжысёрскай падтрымкі. Нават генеральнай рэпетыцыі не праводзілася. Аб гэтым жа сведчаць і зацягнутыя пацяшальныя нумары.

**— Акрамя работы мастака-пастаноўшчыка ты апранула ў шыкоўныя вячэрнія туалеты «ад Святланы» ўсіх удзельніц конкурсу.**

— Гэтыя туалеты каштавалі мне як некалькіх месяцаў карпатлівай ручной працы, бо прышывала сама кожную пацеркчку, так і шмат грошаў за матэрыял.

**— Конкурс скончыўся, глядзельная зала апусцела. Тваё ўражанне?**

— Мне вельмі падабаліся адносіны канкурсантаў паміж сабой. Іра Мультан, напрыклад, з захапленнем прызналася: «Дзяўчынкі, вы ўсе такія прыгожыя, і я вас усіх люблю». Наташа Гатоўка жадала б купіць адзінаццаць карон і ўсім раздаць. Спадабалася мне і журы. Яно было аб'ектыўным і сумленным. І ўвогуле, увесь конкурс прайшоў на вышэйшым узроўні.

**— І тым не менш 26 сакавіка ў газеце «Знамя юности» з'явіліся нататкі, якія наўрад ці назавеш добразычлівымі.**

— На вялікі жаль, такая публікацыя з'явілася. Яна шакіравала і мяне, і ўдзельніц, і гледачоў, а галоўнае — кінула цень на гонар універсітэта. Па ўяўленню аўтара, усе ўдзельніцы конкурсу — неразумныя шэрыя мышкі, а гледачы — натоўп дзікуноў. Карэспандэнт не зразумела байку пра асла, і ў трыкатажы яна сапраўды не разбіраецца. А пілі ў зале не аднакурснікі «богемных сокурсниц» (як выказаўся аўтар), а спонсары, і не «водочку», а шампанскае. Што датычыцца білетаў па восем тысяч, то гэтых грошай хапіла толькі заплаціць за арэнду памяшкання. А сваім знаёмым наконт артыкула я адказваю: «Газетам можна верыць, а можна і не верыць».

**— А што на конкурсе было самае смешнае?**

— Самае смешнае? Напэўна тое, што Олю Тачыліну ў канкурсанткі запісалі яе сакурснікі і, пакуль не «прызналіся» ёй, будучая каралева нічога не ведала.

Конкурс прайшоў упершыню, але, як сцвярджае рэжысёр конкурсу Аксана Чупрына, стане штогадовым. А нам застаецца спадзявацца, што прыгажосць выратуе калі не свет, то хаця б конкурс.

**Наташа КРЫШТОПЕНКА.**



**На фотаздымку: Наталля Грыгаровіч**
**Фота М. Жылінскай**

● ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР

# КРАСАВІК

1921

18 красавіка. Прэзідыум ЦВК Саветаў Беларусі прыняў пастанову аб адкрыцці ў Мінску Беларускага дзяржаўнага універсітэта і пачатку заняткаў на рабочым, грамадскіх навук, медыцынскім, сельскагаспадарчым і фізіка-матэматычным факультэтах.

1922

1 красавіка. Вячэрні рабфак універсітэта пераўтвораны ў дзённы.

1923

Красавік. Наркам асветы БССР набыў для бібліятэкі збор кніг гісторыка А. П. Сапунова.

1924

Красавік. Выбраны новы склад Праўлення БДУ. Рэктарам універсітэта перавыбраны праф. У. І. Пічэта.

1925

Красавік. Універсітэт набыў бібліятэку акадэміка К. К. Грота па славяназнаўству.

1928

5 красавіка. На пасяджэнні Нацыянальнай камісіі ЦВК БССР заслуханы даклад аб ходзе беларусізацыі ў БДУ.

1934

12 красавіка. Ва універсітэце адбылася 1 канферэнцыя маладых фізікаў. У ёй бралі ўдзел 200 вучняў 6—8-х класаў мінскіх школ.

1938

10 красавіка. Прынята Пастанова СНК СССР аб уводзе з 1 верасня ва ўсіх ВНУ краіны чатырохбальнай сістэмы адзнак: «выдатна», «добра», «здавальняюча», «нездавальняюча».

1946

29 красавіка. Прынята Пастанова Савета Міністраў СССР аб павелічэнні тэрміна навучання на завочным аддзяленні універсітэта з пяці да шасці гадоў.

1951

14 красавіка. Убачыў свет соты нумар шматтыражнай газеты БДУ «За сталінскія кадры».

1952

27 красавіка. У мотапрабегу па маршруце Мінск-Масква бралі ўдзел 14 студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ.

1957

Рэктарам універсітэта назначаны акадэмік АН БССР А. Н. Сеўчанка.

1959

Зарадзіўся рух за права называцца лепшай студэнцкай вучэбнай групай на факультэце.

1963

18 красавіка. Універсітэт наведаў генеральны дырэктар Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі Сігвард Эклунд.

1968

Красавік. Студэнты-філолагі бралі ўдзел у канферэнцыі, прысвечанай стагоддзю са дня нараджэння М. Горкага. Канферэнцыя адбылася ў Йенскім універсітэце (ГДР).

1970

1 красавіка. На базе трох кафедраў матыматычнага факультэта створаны факультэт прыкладной матэматыкі (ФПМ). Дэканам выбраны прафесар Іваноў.

1971

На хімічным факультэце праведзена Усесаюзная хімічная алімпіяда школьнікаў.

1972

24 красавіка. Адкрыта праблемная навукова-даследчая лабараторыя меліярацыі ландшафту.

1973

20 красавіка. Адбылася студэнцкая канферэнцыя, прысвечаная дзесяцігоддзю студэнцкага будаўнічага руху.

1976

Група «Долг» выявіла 254 прозвішчы загінуўшых у час вайны студэнтаў і выкладчыкаў БДУ.

1979

16—21 красавіка. Упершыню праведзены Дні гістарычнага факультэта. У іх праграме: XXXVI студэнцкая навуковая канферэнцыя, прысвечаная 109-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна, прэс-канферэнцыя, медыум.

1980

Праведзены першыя спаборніцтвы па спартыўных танцах, якія арганізаваў студэнцкі клуб і прафкам універсітэта. У конкурсе бралі удзел 17 танцавальных пар з Кіева, Масквы, Вільнюса, Горкага, Каўнаса і Мінска.

1981

Адбыўся агляд мастацкай самадзейнасці выкладчыкаў і супрацоўнікаў, прысвечаны 60-годдзю БДУ. Першае месца прысуджана калектыву фізічнага факультэта, другое — факультэту радыёфізікі, трэцяе месца падзялілі хімічны факультэт і НДІ ФХП.

1987

10 красавіка. Праведзены універсітэцкі Дзень адчыненых дзвярэй. Прысутнічалі 1200 абітурыентаў.

# ГЭТА НЕ ЖАРТАЧКІ, ГЭТА — СВЯТА!!!

## 1 красавіка у другім інтэрнаце універсітэта







*Фотарэпартаж Аляксея Супруна.*

ВЕДАЙ НАШЫХ!

# У ФІНАЛЕ «ЗАЛАТОЙ ДЗЕСЯТКІ» ДВА ВЫХАВАНЦЫ БДУ

**17 красавіка на Беларускім тэлебачанні адбудуцца здымкі фінальнай гульні першага рэспубліканскага конкурсу маладых палітыкаў «Залатая дзесятка».**

**Пачаўшыся яшчэ на пачатку мінулага года, ён нарэшце дасягнуў фінішнай рысы. І за гэты час ён паспеў стаць выдатнай загартоўкай многім маладым людзям, якія імкнуцца праявіць сябе ў гэтай немалаважнай сферы жыцця, але не могуць знайсці шлях да шырокай вядомасці. Вось і стаў конкурс для іх гэткай сцяжынкай да папулярнасці і адначасова развеяў меркаванне, што новае пакаленне выбірае толькі «пепсі».**

**Гэтай сцяжынкай прайшоў не адзін з выхаванцаў БДУ. А двое дайшлі нават да фіналу. Адзін з іх — сённяшні студэнт завочнага аддзялення юрыдычнага факультэта Уладзімір Рэзнікаў. 17 красавіка яму прыйдзецца паспрачацца за перамогу з колішнім студэнтам філалагічнага факультэта Максімам Табаравым і Віктарам Босакам, навуковым супрацоўнікам БНДІГА.**

**Як бы ні скончылася для іх гульня, усе маюць намер рушыць у вялікую палітыку. Таму сёння не лішнім будзе мой расповяд пра «кандыдатаў у прэзідэнты» больш падрабязней. А калі ўжо сур'ёзна, то можа якраз нехта з іх у недалёкім будучым на самой справе будзе ўплываць на палітычнае жыццё рэспублікі.**



**РЭЗНІКАЎ Уладзімір.** 24 гады. Нарадзіўся і скончыў школу ў Дзяржынску. Пасля вучобы ў Ленінградскім ваенна-палітычным вучылішчы год знаходзіўся на вайсковай службе. Потым працаваў у Міністэрстве юстыцыі Рэспублікі Беларусь. Зараз працуе ў Дзяржынску. Жанаты. Па асабістаму прызнанню, у фінал тэлеконкурсу «Залатая дзесятка» выйшаў дзякуючы сур'ёзнай падрыхтоўцы, узважанасці палітычных поглядаў. Дарэчы, ён іх сфармуляваў так: прыярытэт праву чалавека ва ўсіх галінах дзейнасці. Ні адной з партый не сімпатызуе. Сваю бліжэйшую палітычную дзейнасць уяўляе пакуль не вельмі актыўнай. Гэта тлумачыцца ўпэўненасцю, што ў палітыку трэба прыйсці поўнасцю сфарміраванай асобай. Пакідаць кар'еру юрыста пакуль не плануе, але ў той жа час мае намер збіраць наяўныя «дывідэнды». Мэтай сваёй дзейнасці лічыць пабудову ў Беларусі цалкам бяспечнага грамадства.

◆



**Максім ТАБАРАЎ.** Нарадзіўся ў Барысаве, вучыўся ў Лошыцкай сярэдняй школе. Потым скончыў філфак БДУ. Служыў у арміі. Жанаты, гадуе сына. Сям'я Табаравых жыве ў новай аднапакаёвай кватэры, на ўладкаванне якой, па словах Максіма, ідзе ўвесь вольны час. Вольнага ж часу ў рэпарцёра газеты «Рэспубліка» не надта шмат. Не любіць пісаць заметак пра падаражанне, хаця жыццё і вымушае. Зусім выпадкова трапіў на тэлеконкурс. Ужо зараз дзякуе яму за ўрокі сур'ёзнай барацьбы. Упэўнены, што галоўнае для палітыка — не гладкая праграма, а талент знайсці агульную мову з аудыторыяй і не адмаўляцца потым ад сваіх слоў. Дзейнічае па прынцыпу «Калі не я, то хто?». Максім рашуча настроены на палітычнае жыццё: на будучых выбарах мае намер выставіць сваю кандыдатуру ў дэпутаты. Лічыць, што толькі маладыя, энергічныя дэпутаты могуць абудзіць спячы парламент.

◆



**Віктар БОСАК.** 29 гадоў. Нарадзіўся на Берасцейшчыне. Пасля заканчэння дзесяцігодкі паступіў у Гарадзенскі сельскагаспадарчы інстытут. Набытыя ў ВНУ веды змог прымяніць толькі пасля службы ў арміі, працуючы галоўным аграномам у адным з саўгасаў Берасцейшчыны. Аднак, адчуўшы прагу вучыцца далей, падаў дакументы ў аспірантуру Беларускага навукова-даследчага інстытута глебазнаўства і аграхіміі. Паспяхова скончыўшы яе, атрымлівае ступень кандыдата навук і зараз працягвае працаваць у БНДІГА навуковым супрацоўнікам. Кіруе Клубам маладых палітыкаў, ідэя якога нарадзілася на «Залатой дзесятцы» і куды ўвайшлі многія з удзельнікаў конкурса. Лічыць гэта адным з шляхоў паднясць папулярнасць палітыкі сярод моладзі. Упэўнены, што толькі моладзь можа змяніць у краіне палітычную сітуацыю. Называе сябе нацыянальным дэмакратам. Аднак ні да адной з партый не належыць.

**Юрась ЛЯШКЕВІЧ**

# АХОЎВАЦЬ ПРЫРОДУ — ЗНАЧЫЦЬ, ЖЫЦЬ!

Менавіта так думае гэты чалавек, бо ўсё сваё жыццё ён прысвяціў гэтай справе. Наша гаворка з супрацоўнікам органаў дзяржкамітэта па экалогіі Левановічам Аляксандрам Міхайлавічам.

**— Аляксандр Міхайлавіч, якія прыродаахоўныя аб'екты і колькі знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі?**

— У 1993 годзе на тэрыторыі нашай рэспублікі налічвалася прыкладна 176 ахоўных прыродных тэрыторый. У тым ліку запаведнікі, заказнікі, нацыянальны парк. Акрамя таго, прыкладна 114 помнікаў ахоўвы прыроды — памятныя валуны, прыродныя каштоўныя ўтварэнні, асобныя дрэвы і г. д. Усе яны ахоўваюцца дзяржавай і маюць свой вызначаны рэжым утрымання.

**— У якім стане знаходзяцца зараз гэтыя прыродныя аб'екты?**

— Усе вышэй названыя аб'екты маюць розныя статусы. Напрыклад, у запаведніках ёсць спецыяльная ахова, навуковыя ўстановы, якія займаюцца на сваёй тэрыторыі вывучэннем прыродаахоўных працэсаў. Заказнікі, як правіла, не ахоўваюцца і знаходзяцца ў распараджэнні лясгасаў, калгасаў. Інтарэсы апошніх найчасцей не супадаюць з інтарэсамі захавання прыроды. Таму ўзнікаюць канфлікты, і заказнікі не выконваюць сваіх задач.

**— Якія заказнікі па сваёму прызначэнню ёсць на тэрыторыі рэспублікі?**

— Гідралагічныя, ландшафтныя, батанічныя, лекавых траў, журавіннікі, паляўнічыя, заалагічныя. Перад кожным з гэтых заказнікаў стаяць розныя задачы па захаванню прыродных рэсурсаў: жывёльнага свету, гідралагічнага рэжыму або раслінных згуртаванняў.

**— А колькі паляўнічых заказнікаў на Беларусі?**

— У Беларусі чатыры дзяржаўных паляўнічых заказнікі рэспубліканскага значэння — Ленінскі, Налібоцкі, Асвейскі, Каз'янскі. Нядаўна ў Налібоцкі завезлі зуброў з мэтай далейшага рассялення іх па тэрыторыі рэспублікі. Дагэтуль зубры былі толькі ў Белавежскай пушчы, Барысаўскім раёне, Прыпяцкім ландшафтна-гідралагічным запаведніку. Будзем спадзявацца, што прыжывуцца яны і ў Налібоцкім заказніку. А што датычыцца стану заказнікаў, то ён пагаршаецца, як і ўвогуле па ўсёй паляўнічай гаспадарцы. На тэрыторыі заказніка забараняюцца ці абмяжоўваюцца некаторыя віды гаспадарчых работ: высечка лесу, узворванне, меліярацыя, збіранне ягад і лекавых траў. Але сустракаюцца грубыя парушэнні, пачасціліся выпадкі браканьерства. Пакідае жадаць лепшага ўтрыманне заказнікаў і біятэхнічныя мерапрыемствы, якія праводзяцца на іх тэрыторыі.

**— І магчымы шлях да вырашэння гэтай праблемы?**

— Я ўжо звяртаў вашую ўвагу на тое, што ў адрозненні ад запаведнікаў, якія падпарадкоўваюцца Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, заказнікі знаходзяцца ў распараджэнні мясцовых органаў — калгасаў, саўгасаў, лясгасаў. Я лічу, што трэба стварыць адзіны орган па ахове прыродных аб'ектаў і надзяліць яго не толькі матэрыяльна-тэхнічнымі рэсурсамі, але і прававым заканадаўчым актам.

Інтэрв'ю правяла **Л. САЛДЗІНА.**

**НАШ НЕВЯДОМЫ УНІВЕРСІТЭТ**

# УСПАМІНЫ

*Рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» атрымала цудоўную магчымасць пазнаёміць сваіх чытачоў з успамінамі Іны Рытар — адной са старэйшых беларускіх пісьменніц, былой настаўніцы беларускай гімназіі імя Я. Купалы, вядомай у асяроддзі беларускай эміграцыі пад псеўданімам Аляксандра Саковіч. Яе кніга «У Пошуках Праўды», выдадзеная Беларускім інстытутам навукі і мастацтва ў 1986 годзе, прыхільна сустрэта нашымі суродзічамі ў Амерыцы, Канадзе, Аўстраліі, Нямеччыне. Анталогію выбраных твораў А. Саковіч склалі аповесці «Браты», «Між Сцылай і Харыбдай» і 12 апавяданняў.*

*Цяпер Іна Рытар жыве ў Кліўлендзе, ёй — 88 гадоў.*

*Для нас бясспрэчную цікавасць уяўляе ўсё тое, што пісала Аляксандра Саковіч пра Беларускі Дзяржаўны Універсітэт, дзе вучылася некалькі гадоў. Нам прыемна, што беларуская грамадскасць пазнаёміцца з гэтымі невядомымі ўспамінамі дзякуючы нашай універсітэцкай газеце.*

*Тэкст друкуецца з кнігі «У Пошуках Праўды» з захаваннем аўтарскага правапісу.*

Мая Альма Матэр — Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт, дзе я правучылася 4 гады, зрабіў вялізны ўплыў на мой сьветапогляд, пакінуў найдаражэйшыя ўспаміны. Там я спаткалася й пасябравала з «Раднёю» — так жартам празвалі сябе сьведамыя беларусы-студэнты. У сваім асяродзьдзі «Радня» не баялася выказваць асабістыя пагляды ў палітычных пытаньнях, не хавалася з нацыянальнымі марамі й імкненьнямі. Сярод «Радні» была ня толькі моладзь, але й старэйшыя гадамі «дзядзькі» — вэтэраны першай сусьветнай ці грамадзянскай вайны, а часта й удзельнікі руху за незалежнасьць Беларусі. Не з свае волі яны згубілі гады навукі й пашлі давучвацца. Амаль усе яны, каб мець мажлівасьць вучыцца ў унівэрсытэце, мусілі працаваць, бо мелі ўжо сем'і, якія ім трэба было ўтрымліваць.

«Радню» можна было знайсьці на ўсіх факультэтах БДУ, але найбольш яе было на сацыяльна-гістарычным аддзяленьні Пэдфаку. На гэтым аддзяленьні лекцыі чыталі высока кваліфікаваныя, вядомыя навукоўцы. Кожны студэнт-гісторык, які студыяваў у БДУ ў дваццатыя гады, можа з гонарам адзначыць, што ён быў вучнем праф. Мітрафана Доўнар-Запольскага, праф. Усевалада Ігнатоўскага, праф. Уладзімера Пічэты. Неабходна далучыць да гэтых славутых імёнаў і маладога таленавітага праф. Васіля Дружчыца, які распачаў сваю навуковую кар'еру ў нашым унівэрсытэце дацэнтам. «Радня» любіла працаваць у галіне беларускай гісторыі на сэмінарах праф. В. Дружчыца, любіла самога маладога навукоўца. Яна часта запрашала яго сфатаграфавацца разам на памяць. Адно з такіх фотаў якімсь цудам зьбераглося ў мяне, ня згубілася ў працягу майго складанага, нялёгкага вандраваньня па сьвеце. На ім маю сяброўку Броню Паўлоўскую й мяне, як малодшых з «Радні», пасадзілі ў цэнтры побач прафэсара.

У другой палове дваццатых гадоў сытуацыя на гістарычным аддзяленьні Пэдфаку пачала мяняцца ў няспрыяльны для незалежнае беларускае навукі бок. У 1926-ым годзе ўлады загадалі праф. М. Доўнар-Запольскаму пакінуць Менск і Беларусь. Не шанцавала й студэнтам. Прыкладам, мне, якая ніколі ня была ні камсамолкай, ні партыйкай, пасьля заканчэньня унівэрсытэту прапанавалі выкладаць не грамадазнаўства (так тады зваўся курс гісторыі ў школах), а мову й літаратуру, на што я мусіла згадзіцца. Нагул, ад канца дваццатых гадоў на гістарычнае аддзяленьне дапускаліся пераважна партыйцы ці камсамольцы. «Радня» там зьнікла.

Я ўжо працавала выкладчыцай Рабфаку пры БДУ, калі надыйшоў пакутлівы 1930-ты год, а за ім нешчасьлівая дэкада, адна з самых трагічных у летапісу нашае нацыі. У тую дэкаду брутальна была зьнішчана вялікая колькасьць беларускіх навукоўцаў, пісьменнікаў, паэтаў, грамадзкіх дзеячоў. Сярод беларускае грамады панавала пачуцьцё няпэўнасьці ў заўтрашнім дні. Арыштоўваўся ня толькі той, хто аднойчы знайходзіўся ў апазыцыі да камунізму ці да камуністычнай улады, але кожны, хто ўважаўся ў стане выявіць супраціў. Тых, каго пакінулі на волі, прымушалі выступаць з пакаяннымі лістамі, з асудам свае папярэдняе нацыянальнае дзейнасьці, з паклёпамі на блізкіх сяброў. Відаць, пад прымусам Зьмітрок Бядуля напісаў раман «Язэп Крушынскі». Заўсёды разважлівы, заўсёды ветлівы да людзей З. Бядуля ў гэтым рамане фальшыва зганіў амаль усіх выдатных беларусаў, надзяліў іх адмоўнымі рысамі. ашчадзіў, найбольш усіх абразіў свайго сябру Купалу, ягоную жонку, яг ных сваякоў. Ці дарава яму Я. Купала? Казалі што дараваў, толькі ня хутка. Сам Я. Купала не згадзіўся адразу «сябе таптаць», зрабіў гаракіры. Праф. У. Ігнатоўскі застрэліўся.



**НА ФОТАЗДЫМКУ: Іна РЫТАР (Аляксандра САКОВІЧ).**

**ПАГАВОРЫМ ПА ШЧЫРАСЦІ**

# ЦІ ПЕРАЖЫВЕ КІНЕМАТОГРАФ 2000-НЫ ГОД?

*Ефрасіння Бондарава — вядомы беларускі кіназнаўца, доктар філалагічных навук, выкладчык факультэта журналістыкі БДУ, аўтар дзесяці кніг. «Кінематограф і літаратура: творы беларускіх пісьменнікаў на экране» — апошняя з іх. Яна выйшла ў свет у канцы мінулага года. Прапануем інтэрв'ю нашага карэспандэнта з Ефрасінняй БОНДАРАВАЙ:*

*— Ефрасіння Леанідаўна, ваша кніга расказвае пра экранізацыі. Калі я яе прачытала, то мне здалося, што большасць значных беларускіх фільмаў — экранізацыі рускай, беларускай літаратуры.*

— Сапраўды, усё самае лепшае ў беларускім кіно ўзнікла на аснове літаратуры. Калі бярэцца для экранізацыі значны літаратурны твор, то які б рэжысёр ні быў, у фільме нешта застанецца ад першаасновы. Пачынаючы з фільма Юрыя Тарыча «Лясная быль» (1926 год), які грунтаваўся на аповесці Міхася Чарота, беларускае кіно прарывалася за сярэдні ўзровень найперш у фільмах, асновай для якіх была літаратура, як класіка, так і сучасныя творы. «Бацькі і дзеці» — вядомая экранізацыя Вячаслава Нікіфарава твора І. Тургенева, якую хвалілі і спецыялісты, і аматары кіно. У фільме адбылося адкрыццё галоўнага героя рамана — Базарава. Я лічу, што фільмы рэжысёра В. Турава «Людзі на балоце», «Подых навальніцы» — грунтоўнае асэнсаванне выдатных твораў Івана Мележа. Можна паставіцца да стужак крытычна: у іх не вытрымана норма аўтарскай мовы, у фільмах больш светлы і лірычны фон, чым у Мележа. Але фільмы гэтыя — адкрыццё чалавечых характараў Васіля і Ганны, якія стварылі А. Барзова і нябожчык Ю. Казючыц.

*— Фільмаграфія экранізацый твораў беларускай літаратуры з 1926 па 1992 гады, якая прыведзена ў кнізе, складзена Вамі?*

— Так. На жаль, поўнага фільмаграфічнага даведніка на Беларусі няма наогул. Але ж фільмаграфія іграўых і часткі дакументальных стужак была створана пры напісанні «Гісторыі беларускага кіно», якая выйшла двухтомнікам у канцы 60-х гадоў. З таго часу фільмаграфіяй ніхто не займаўся. Калі я пачала складаць яе, то спачатку карысталася звесткамі, што меліся ў «Гісторыі беларускага кіно», а пра фільмы, якія з'явіліся пасля 1967 года, збірала інфармацыю сама. З 1990 года ўсё рассыпалася ў сістэме кінавытворчасці, і невядома, хто дзе што здымае. Раней быў улік кінапрадукцыі. Цяпер жа ніхто дакладна не ведае, колькі і якія стужкі ствараюцца, дзе іх паказваюць. Таму, можа, у гэты перыяд у маёй працы нешта з экранізацый і не ўлічана. Аднак на 90 працэнтаў я гарантую дакладнасць сабраных мною звестак.

*— Цяжка было выдаць кнігу ў наш час?*

— Нялёгка. Мне дапамаглі зрабіць гэта, апрача рэктарата БДУ і выдавецтва «Універсітэцкае», студыя «Беларусьфільм» і акцыянернае таварыства кампаніі «ВІТТ». Я ім вельмі ўдзячная. На жаль, кніга стратная. Мне сорамна, што яна дрэнна аформлена. Аднак, будзем спадзявацца, гэта не спыніць тых, хто цікавіцца беларускім кінематографам.

*— Ефрасіння Леанідаўна, ці характэрна, на вашу думку, такая колькасць экранізацый, як у беларускім кіно, для іншых кінематаграфій былога СССР?*

— Літаратура здаўна з'яўлялася асновай кінематографа. Калі б яна не падзялілася з ім сваімі набыткамі, кіно не адбылося б як мастацтва. Яно было б бяднейшым, больш тэхнічным, трукацкім. Калі ж кінематограф імкнуўся быць вобразным псіхалагічным мастацтвам, ён не мог абысціся без сур'ёзнай літаратуры. І гэта тычыцца кіно ўсіх краін.

*— Якія тэндэнцыі ў развіцці кінамастацтва вы бачыце сёння?*

— Паўсюль яно па сваім абліччы некалькі адрозніваецца ад таго, якім было раней. Яго больш цікавіць жанравы аспект, праяўленне незвычайных тэхнічных сродкаў. Кінематограф амаль не бярэ на сябе абавязак даследаваць глыбінныя сацыяльныя задачы. Ёсць тэорыі, якія даказваюць, што наогул нельга патрабаваць ад мастацтва даследавання жыцця. Хай, маўляў, мастацтва фіксуе тое, што адбываецца або стварае камфорт для адпачынку. Мне здаецца, што гэта ўсё ж такі прыніжэнне магчымасцяў мастацтва. Многія зараз задаюцца пытаннем, ці зможа кінематограф перажыць 2000-ны год. Спадзяюся, што перажыве. Праўда, у яго, як і ў мастацтве наогул, няма сёння той кропкі, з якой можна было б па-новаму разглядаць чалавека. Пакуль вывучаюцца яго ценявыя бакі, недасканаласці. А людзі ж розныя. Мастацтва якраз дапамагала ім устаць на ногі, калі яны стаялі на каленях, дапамагала ачысціцца. Чаму зараз яно адыходзіць ад такіх задач? Айчынны кінематограф, літаратура часта пераймаюць эстэтычныя тэорыі Захаду, якія сябе ўжо перажылі, і там цяпер усё часцей і часцей вяртаюцца да забытага, да рэалізму ў тым ліку. Мастацтва, якое заклапочана жыццёвымі праблемамі, а не касмічнымі войнамі, чалавекам з яго рэальнымі праблемамі, не слабее. Канешне ж, ёсць іншыя плыні, якія маюць права на існаванне. Але ж калі рэалізм вычарпае сябе, то мастацтва не прарвецца на нейкія новыя вышыні, да якіх яму ў будучым стагоддзі абавязкова трэба дайсці. Яно будзе праходзіць той шлях, які ўжо даўно асвоены, толькі на новым тэхнічным узроўні.

*— Мне здаецца, што дасягненні тэхнікі, якія выкарыстоўваюцца шырока пры стварэнні фільмаў, не ў стане замяніць (а на гэта яны часта прэтэндуюць) таленавітай ігры акцёраў, яркай драматургіі, рэжысуры, духоўнай напоўненасці карціны...*

— Так, безумоўна. Аднак рэальнасць у тым, што сучаснае кіно робіць стаўку на магчымасці плёнкі, апаратуры. Дынаміка — вось вызначэнне нашага часу. Галоўная прычына таго, што тэхніка падмяняе псіхалагічны, эстэтычны, маральны ўзровень даследавання чалавека, па-мойму, у крызісе ідэй, памкненняў грамадства. У нас і па ўсім свеце традыцыйныя ідэалы скампраметаваны. Новыя далягляды не адкрываюцца, і духоўнае азарэнне не наведвае людзей. Выкарыстанне тэхнікі запаўняе пустэчу ў думках і пачуццях. Аднак я спадзяюся, што ў кіно ёсць яшчэ што сказаць. Яно зможа, мне здаецца, вярнуцца да сваёй першаснасці, мастацкасці, якой дасягнула ў лепшых сваіх творах розных часоў.

*— Ефрасіння Леанідаўна, ці можаце вы назваць беларускі кінематограф нацыянальным?*

— Праблема нацыянальнага ў такім інтэрнацыянальным мастацтве, як кіно, вельмі сур'ёзная і складаная. І яна не даследавана ва ўсёй нашай мастацтвазнаўчай навуцы. Беларускае кіно ўсё ж такі адчужанае ад нацыянальнай культуры.

*— Якія, на ваш погляд, асноўныя прычыны гэтага?*

— Беларускі кінематограф пачынаўся, калі фабрыка будавалася ў Ленінградзе. Там жа знаходзілі і кадры. Пра выхаванне сваіх не дужа клапаціліся. Часта на Беларускую кінастудыю прыязджалі людзі, якія належалі да розных культур. Некаторыя шукалі магчымасць зняць у Беларусі 1—2 карціны і ад'язджалі.

Аднак сказаць, што беларускае кіно зусім не стасуецца з беларускай культурай, азначае прынізіць яго значэнне. У лепшых творах беларускага кіно ёсць нацыянальная ідэя. Я зусім не падзяляю думку людзей, якія гавораць, што ў нас няма нацыянальнага кінематографа, таму ён нам не патрэбен наогул. Не можа дапусціць рэспубліка, якая паважае сябе, каб у ёй не было такога сучаснага дынамічнага мастацтва, як кіно. Іншая справа, што яго трэба цясней звязваць з традыцыямі нацыянальнай культуры. І не спрошчваць пры гэтым разуменне нацыянальнага. Гэта не адна толькі мова, хоць і яна таксама. Сапраўды, на Беларусьфільме звычайна здымаліся фільмы на рускай мове або ў двух варыянтах. Першы варыянт — на рускай, другі — на беларускай. Калі б нашы кінематаграфісты рабілі фільмы толькі на беларускай мове, іх не ўбачылі б нідзе, акрамя рэспублікі. Для пракату гэта занадта малая прастора.

Акрамя мовы, нацыянальнае — гэта тэма, характары, асаблівасці светаадчування. Я перакананая ў тым, што кінематограф у любой краіне не можа абмежавацца толькі нацыянальным. Але ж такія фільмы павінны быць яго асновай.

*— Акрамя камерцыйных стужак у апошні час пачалі выходзіць фільмы як ігравыя, так і дакументальныя, якія закранаюць праблемы беларускай культуры, гісторыі. Ці задавальняе вас іх узровень?*

— Мяне радуе з'яўленне цэлага шэрагу дакументальных карцін, якія распавядаюць пра пласты беларускай гісторыі, культуры, якія дагэтуль былі невядомымі. Сярод іграўых фільмаў менш адкрыццяў. Напрыклад, стужка, знятая па п'есе Я. Купалы «Тутэйшыя» рэжысёрам Валерыем Панамаровым, здалася мне толькі данінай нацыянальнай тэматыцы. Фільм гэты — прыклад спрашчэння нацыянальнага пытання.

*— Вам не здаецца, што такія фільмы разам з непрафесійна агучанымі мультфільмамі, іншымі слабымі мастацкімі стужкамі шкодзяць прапагандзе беларускай мовы, культуры?*

— Вядома ж, не дапамагаюць. Узровень, на якім здымаюцца, агучваюцца некаторыя фільмы, зусім не стасуецца з мастацтвам. Сёння галоўнае — дастаць грошы, якіх не хапае. Пры мінімальных сродках цяжка патрабаваць ад рэжысёра пераздымак, перазапісу. І нават у лепшай эканамічнай сітуацыі мастацкі ўзровень твораў не заўсёды дасягаецца. Вядома ж, што ў дасканаласці няма мяжы.

Творчасць — справа індывідуальная. Але стварыць умовы для яе — справа не толькі мастака, але і грамадства. Яно не павінна мірыцца з тым, каб халтура падмяняла творчасць.

*— Ефрасіння Леанідаўна, як жыве кінастудыя «Беларусьфільм» сёння? Ці здымаюцца там цяпер фільмы-экранізацыі беларускай літаратуры?*

— Цяжка жыве: база не абнаўляецца, нестае грошай на ўтрыманне кваліфікаваных спецыялістаў. таму павільёны і тэхніка няшчадна эксплуатуюцца арандатарамі. Але нешта ствараецца і сваё, у тым ліку і на аснове твораў беларускай літаратуры. Летась адбыліся прэм'еры фільмаў В. Турава «Чорны бусел» паводле аповесці В. Казько «Выратуй і памілуй нас, чорны бусел», В. Нікіфарава «Душа мая, Марыя» па матывах п'есы Д. Міхлеева «І трэці анёл абвясціў». Да літаратуры — беларускай, рускай і іншых краін — звяртаюцца навучэнцы кінафакультэта Акадэміі мастацтваў (рэжысёрская група пад кіраўніцтвам В. Турава). Беларускія пісьменнікі (Р. Барадулін, В. Казько і інш.) прымаюць удзел у стварэнні дакументальных стужак аб дзеячах беларускай культуры. Нядаўна я паглядзела дылогію пра філосафа і асветніка сярэдневечча Казіміра Лышчынскага «І аз вздам»... Разам з беларускім драматургам В. Бутрамеевым яе пачынаў (пад назвай «Д'яблу і богу») вядомы рэжысёр нашага кіно Барыс Сцяпанаў (цяпер ужо нябожчык), а завяршаць давялося Б. Шадурскаму і М. Касымавай. Ведаю, што І. Дабралюбаў экранізуе новыя апавяданні І. Шамякіна, В. Тураў таксама шукае падмурак новай пастаноўкі ў творах беларускай літаратуры. Так што сувязі кінематаграфістаў і літаратараў працягваюцца. Трывога за іншае: ці патрапяць іх творы ў шырокі пракат. Там жа пануе прадукцыя іншага гатунку — амерыканскага, з жахамі і суперменамі, грубым натуралізмам і іншымі шок-прыманкамі. Пракатчыкі так прызвычаіліся на іх зарабляць грошы на «выжыванне», што айчынную ціхамірную прадукцыю не дужа паважаюць.

Ды і каштуе яна на кінарынку болей, чым заморская...

Вось такая сітуацыя ў беларускім кінематографе, якому сёлета споўніцца 70 год.

**Гутарку вяла**
**Алена СПАСЮК**



## ЭМОЦИОНАЛЬНЫЕ КАЗУСЫ И МИРОВОЗЗРЕНЧЕСКИЕ КАТАКЛИЗМЫ ОБОЗНИЧЕСКОЙ ЛИРИКИ ПАФНУШИ

Целью настоящей публикации является знакомство неискушенного в современных литературных веяниях читателя. Это совсем недавно возникшее направление в студенческой культуре — литературный арьергардизм (основатель этого течения, он же пока единственный его представитель настаивает на другом названии — обозничество). Как рецензент со стажем спешу поделиться с читателем своим глубоким убеждением в том, что описывать новое направление в нетрадиционном искусстве — занятие неблагодарное. Но если тебе выпало нести этот крест, именуемый искуствоведением, будь добр — ассенизируй этот отстойничек всех новых ультрасовременных, псевдолитературных течений с тем же рвением, с каким Белинский аннотировал всякий новый опус Некрасова. Думаю, никто не будет оспаривать мнение, что для составления объективного представления о литературном стиле лучше всего обратиться к первоисточнику. И это читателю еще предстоит, если учесть, что почти вся 4-я полоса газеты занята вызывающей неоднозначную оценку поэзией Пафнуши. Свою же функцию автор этих строк видит в эстетическом анализе арьергардизма (обозничества), а поскольку нетленная сентенция «все познается в сравнении» не раз подтверждала свою истинность, я решил построить анализ этого нового литературного направления на сопоставлении его с уже ставшими достоянием целой литературной эпохи литературными течениями: классикой, футуризмом, куртуазным маньеризмом, сюрреализмом и авангардизмом.

С первого же взгляда бросаются в глаза ставшие уже академическими, известные каждому со школьной скамьи поэтические размеры: пушкинский хорей и лоханкинский пятистопный ямб. Но мысли о литературном плагиате развеивает выразительное отличие от контекста негорящих в пламени вечности опусов Васисуалия и вдохновенных виршей Александра Сергеича. Поэзию Пафнуши отличает отсутствие какой-либо фабулы (то, чем грешили классики) в сочетании с такой пестрой идейной палитрой, которая способна даже в самом последнем олигофрене разжечь искру долговременной интеллектуальной плодовитости, чреватой, однако, для неподготовленного читателя усугублением шизофрении и рецидивом невроза навязчивости.

Нет в литературном арьергаргардизме и прямолинейности, свойственной урбанистическому пафосу футуризма. Поэтический гурман оценит «эстетический аромат» литературных маразмов, прелесть щемящих сердце и вызывающих приятную истому, переходящую в истерическую эйфорию, плоских, приятных двусмысленностей поэзии **ПАФНУШИ**. Маршевый слог также чужд обозничеству, проповедующему (и здесь, увы, не избежать ложки дегтя) излишне приторный маньеризм. Однако арьергардизм в лице Пафнуши не ограничивает себя эротическим созерцанием лишь женщин. Предметом сексуального переживания обозника может стать все что угодно: от очков друга, связанного с автором лишь платоническими узами до уже год как пустой бутылки азербайджанского портвейна с разжигающим еще большую похоть годовым слоем пыли и архисексуальным рельефом горлышка, вызывающим в творце острый приступ ностальгии.

Подкупает своей самобытностью и умиляет своей непосредственностью вульгаризированный натурализм лирики Пафнуши — черта, позаимствованная у сюрреалистов. Но к чести Пафнуши, он, в отличие от сюрреалистов, не притязает на глубинный смысл своих натуралистических образов и не аппелирует к бессознательному читателя. Порочная практика психоаналитического самокопания, саморасчленения, самопахания и самоудобрения безжалостно бичуется Пафнушей. Привнесен в поэзию Пафнуши, и об этом уже говорилось выше, элемент смысловой шизоидности и фонетической энтропии. Но, не в пример авангардистам, Пафнуша не злоупотребляет каббалистической техникой написания строф. Он далек от илюзии, что рифма и форма способны к самоорганизации и автономии от автора. По словам самого Пафнуши, «все попытки сепаратизма со стороны слов и знаков препинания присекаются им на корню». В том, что Пафнуша держит в узде строку и слог, язык и форму, читателю еще предстоит убедиться, обратившись непосредственно к лирике этого самобытного, оригинального, неординарного (как он сам об этом неоднократно упоминает) поэта.

Аннотацию подготовил друг и соратник Пафнуши, его источник вдохновения, тот, встреча с которым явилась ярчайшей страницей биографии прославленного поэта — основоположника арьергардизма (обозничества), литературный критик

Вихрь **ВРАЖДЕБНЫЙ**.

***ЭПИГРАФ***

*Инда взопрели озимые.*
*Рассупонилось красно*
*солнышко.*
*Растолдыкнуло лучи свои по*
*белу светушку.*
*Понюхал Рамуальдыч свою*
*портянку*
*и аж заколдобился...*
*(Из предтечи арьергардизма).*

*P. S. В духе традиций новоявленного литературного направления эпиграф помещен в конце рецензии — опуса на обозническую лирику Пафнуши.*

# В КУЛУАРАХ ПОД ДЫМКОМ

***Гэтай старонкай мы маем намер адкрыць своеасаблівы студэнцкі клубтусоўку, дзе б кожны студэнт мог уразіць нас сваёй арыгінальнасцю і творчымі адкрыццямі.***

● ● ●

## ПОЧЕМ ОПИУМ ДЛЯ СТУДЕНТА ИЛИ О ДОСТОИНСТВАХ И НЕДОСТАТКАХ ТРАНСЦЕНДЕНТНОГО ОПЫТА

Есть что-то парадоксальное в том, что представители естествоведческих дисциплин — приверженцы рационального эмпиризма — обратились к трансцендентному опыту, причем в такой ортодоксальной форме, как употребление галлюциногенных средств. И не стоит внимательно-критичному читателю усматривать в этом факте склонность юной технической интеллигенции к нетрадиционному направлению в экспериментальной науке, когда один ученый муж сочетает в себе два амплуа: активного экспериментатора и пассивного подопытного. Идея приобщения к трансцендентному опыту витала в наших головах задолго до чудесного дня реализации оной. Идея оформилась в виде реальной глоссы (читай—образа) нашего общего знакомого Дэвида, известного на факультете специалиста в области программирования, славящегося своим лояльным отношением к панк- и хиппи-культуре. Упомянутый Дэвид появился в дверях нашей комнаты столь неожиданно, сколь неожиданным было появление Призрака вице-короля Дании в покоях Гамлета. Единственное, что отличало Дэвида от мнимого персонажа шекспировской трагедии — это осязаемость его форм и содержание тирады, которую обрушил на нас наш визитёр. Нет, в его словах не было патетических призывов к мести за смерть наших отцов: его монолог состоял из приветствия из трех-четырех фраз, красноречию которых позавидовал бы сам Цицерон, и популярной лекции о превосходствах иррационального опыта, так называемой virtual reality, над реалиями повседневной жизни. Для студентов — это монотонные семестровые учебные будни, однообразные пьянки да являющиеся источником богатых по своей форме последствиях неврозов сессии. А когда лектор обнародовал некоторые факты биографии Великих мира сего, если и не имевших пристрастия к галлюциногенным средствам, то по крайней мере использовавших таковые в качестве акушерского инструментария для разрешения самих себя от творческой беременности (в качестве Великих были упомянуты П. Пикассо, Ф. Феллини, Дж. Леннон. С. Бэррет), вопросы о нашем обращении в веру, проповедуемую этим миссионером Сюрреализма, этим глашатаем Трансцендентализма отпали сами собой. О необходимости учреждения соответствующей этим воззрениям конфессии не осталось сомнений. Основание оной решено было ознаменовать выкуриванием символической порции чудесного зелья, именуемого марихуаной, пакетик с которой родоначальник Прикладной Психоделии предусмотрительно прихватил с собой.

Дорогой читатель, кто тебе сказал, что вся соль лишь в процедуре курения травки? Одна только начинка выпотрошенных беломорин драгоценным порошком в руках «трансцендентала» со стажем может обрести смысл священнодейства, не говоря уже об акте прикуривания, сопровождающемся шаманскими па и каббалистическим бормотанием.

Не удивляйтесь, если запланированный вами с первой попытки выход в астральные измерения не состоится, а вместо него вас охватит истерический смех, нарастающий по мере осознания вами того обстоятельства, что объективных причин для эйфории нет (сюрреалистические образы, к числу которых можно отнести модифицированную картину Ботичелли с Венерой, рождающейся из морской пены с бутылкой «Столичной» в руке, вас ведь еще не посетили). Это случается со многими начинающими. Апогей истерии зачастую совпадает с ощущением остановки сердца. Это обстоятельство страха у вас не вызывает, напротив, смех становится безудержнее. Видано ли это, кровеносная система перестала функционировать, а Вы все еще в сознании, и мало того — веселы до предела. Однако представьте себе реакцию вашего собрата по трансцендентному опыту, который так же, как и Вы, находится под влиянием доброй половины выкуренной порции чудодейственной травки, когда Вы сообщаете ему, преодолевая спазмы смеха, о подобных казусах вашей физиологии. А если при всем при этом он умудряется, приложив руку к вашей груди, не обнаружить ударов сердца, Вам станет понятна лёгкая паника моего друга и его попытки во что бы то ни стало и как можно быстрее запустить сердце горе-наркомана, чей организм столь удивительно реагирует на небольшие дозы слабого, по мнению бывалых наркоманов, наркотика...

Густой смог ароматизирующего зелья уже висел в нашей комнате, когда магнитофон проигрывал помпозицию группы «Pink *Floyd*» «*IF*», а его динамики исторгали психоделические гитарные партии Гилмора и чарующий тенорок Уотерса:

Если я был лебедем я бы улетел,
Если я был бы поездом,
я бы опоздал.
Если стану сходить с ума
Пожалуйста, не запускай свои провода в мой мозг.

Нет, ни лебедем, летящим высоко над землёй, ни поездом, отстающим от расписания, я себя не ощущал, и уж никак не мог представить себе свой мозг в качестве рабочей платы какого-нибудь радиоприбора, требующего в случае неисправности привнесения новых деталей и впаивания новых проводов.

Пробиться в астральные измерения мне так и не удалось, хотя ориентацию в нашем физическом пространстве я уже потерял. Присущие, по мнению Канта, априорные формы чувственности, пространства и времени чудесным образом покинули меня, однако обещанные сюрреалистические образы всё еще не появлялись. И тут я обнаружил в себе до боли знакомое видение мира, до боли знакомое состояние. Да, именно это состояние ощутимой едва эйфории я испытывал, внемля звукам вагнеровской «Валькирии» и «Ave Maria» Шуберта, именно это состояние сладостной истомы я чувствовал, подолгу созерцая репродукции картин Дали, именно это видение мира я обретал, читая Булгакова и Новалиса. Так стоит ли для достижения состояния отрешенности от реалий нашей повседневной жизни, изобильной стрессовыми ситуациями, прибегать к галлюциногенным средствам?..

Творческого материала, обретенного мной в результате психоделического сеанса, стимулированного употреблением марихуаны, хватило лишь на эту статью. И дело скорее не в слабости употребляемого наркотика, а во врожденном отсутствии у автора этих строк какого бы то ни было художественного дарования, ибо в противном случае человечеству бы не миновать рождения новых творений образца «Сикстинской мадонны» Рафаэля или «Реквиема» Моцарта.

Упаси Бог читателя усмотреть в этих строках настоятельную рекомендацию не употреблять наркотики. Более того, тех, кто открыл в себе какой-либо талант или подозревает о наличии оного, спешу уверить в своей убежденности о желательности и даже необходимости прибегания к сеансам по прикладному трансцедентализму в интересах процесса творения. Возможно, тебя, о гениальный читатель, посетит в состоянии углубленной отрешенности образ твоей «Мона Лизы», композиция твоего «Мастера и Маргариты» или текст твоего «Евгения Онегина», быть может, ты уловишь гармонию своей «Лунной Сонаты» или своей «Валькирии».

Двадцатилетний же жизненный опыт автора этих строк убедил его в том, что у него имеется достаточно оснований сомневаться в своей принадлежности к плеяде гениев, а следовательно и потенциальной оправданности употребления сильнодействующих наркотиков, тем паче, что для приобретения лишь маленькой толики оных ему бы пришлось выложить всю свою стипендию — пока единственный для него источник дохода.

**Вихрь ВРАЖДЕБНЫЙ**

# Пафнуша

* * *

***Посвящается Г. Ш, гостю из солнечной страны.***

**Желаю с лестницы свалиться**
**Чтоб головою и об пол**
**чтоб утопиться, удавиться**
**споткнуться, и виском о стол.**

**Желаю СПИДом заразиться**
**И подхватить энцефалит**
**И чтоб потом всю жизнь**
**лечиться,**
**иметь больной и бледный вид.**

**Пусть ноги скрючит вам и**
**руки**
**И окосеют вдруг глаза.**
**Чтоб двигаться вам — были**
**муки.**
**А уши — словно паруса!**

СОНЕТ

**О, сколько раз во сне я убивал**
**И просыпался счастьем**
**опьяненный,**
**Когда Кр-цкий мною**
**убиённый**
**Весь окровавленный у ног**
**моих лежал.**
**О, сколько раз пытался**
**я постичь**
**Его моральный облик**
**извращенца**
**Но мозг его, гнилого**
**отщипенца,**
**Не в силах мозг его здоровый**
**излечить.**
**Кр-цкий болен. И его болезнь**
**Изгнать не может никакой**
**мессия.**
**Я голосую за эвтаназию**
**И пусть замолкнет идиота**
**песнь.**
**И оживет, и расцветет**
**природа,**
**Когда не станет этого**
**урода.**
***3.09.93.***

* * *

О, Фёдор! Свет твоих очей
Пленит свои очарованьем.
Средь шумных и шальных
ночей
Они в минуты возлияний
Горят безумным светом фар,
И люди спьяну убегают
Подумав, что опять пожар
«Экспресс»[1] любимый
пожираст.
О, Фёдор. сколько раз ты был
Затоптан пьяною толпою.
И сколько раз ты водку пил.
И ел, и пел, и я не скрою
Был поражен твоею харей
Дружок П-ва, гад и плут,
Ты долго проживешь едва ли,
С такою мордой не живут.

О, Федор! Я прошу прощенья,
Я, несомненно, дилетант.
Но, заявляю без сомненья,
Что «Роял»[2] все же яд.
И в лучших чувствах
оскорбляя,
Быть может, Фёдор, я тебя,
Авторитетно заявляю:
П-ов — ужасная свинья.[3].
И я боюсь тебя обидеть,
Но это правда, не прикол,
Что очень трудно не увидеть,
Что ты мерзавец и козел.
**8.04.93 г.**

[1] «Экспресс» — питейное заведение рядом с военной кафедрой.

[2] «Роял» — марка этилового спирта.

[3] Свинья — а) распространенный в европейской части бывшего СССР вид животных; б) названье также часто употребляется в качестве синонима к слову «дружок».

* * *

Я на лекции сижу
Дует свежий ветерок
Из окна летит снежок
Белым инеем играя
Моя ручка боевая
Пишет цифры и слова
По пути сугроб сметая,
Лектор, быстро замерзая,
Шепчет умные слова,
Голова его седая
Сплошь сосульками покрыта
И трясет его. Убиты
В теле мысли. Небеса
Извергают снег и холод,
Душу рвет и мучит голод,
А еще нам три часа
Здесь сидеть, писать и
мёрзнуть...
**10.02.93.**

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

*7 красавіка Зак. 1769. Т. 1000 экз.*

*220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75. ТЭЛЕФОН 20-68-27.*

**В. а. рэдактара Т. М. КАЗАК**

*Газета падпісана ў друк 6.04.94 г. у 16.00.*